*1.* Новосибирский государственный педагогический университет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://nspu.ru/socium/foto_v_novosti/Международная программа научной стажировки. – Дата доступа: 25.02.2022.

*2.* Новосибирский государственный педагогический университет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://nspu.ru/Vydayushchiesya_lichnosti. – Дата доступа: 25.02.2022.

*3.* Официальный сайт Международного историко-биографического института [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://whfpdubai.com/ru/pro-ihbi. – Дата доступа: 25.02.2022.

УДК 82.0+378.147:378.096

***С. М. Тычына,***

*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫКЛАДАННЯ ЛІТАРАТУРЫ XIX ст. У СТУДЭНТАЎ ТВОРЧЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ

**Анатацыя.** У артыкуле даследуюцца асаблівасці выкладання літаратуры XIX ст. у студэнтаў творчых спецыяльнасцей. Адзначаецца, што варта звярнуць увагу студэнтаў на цесную сувязь паміж рознымі відамі мастацтва, якая выявілася ў XIX ст., на агучванне пісьменнікамі гэтага часу актуальных праблем, якія не падымаліся раней, і інш. Вылучаны наступныя праблемы, якія могуць узнікнуць пры вывучэнні тэкстаў у студэнтаў:

1. Няўменне звязваць падзеі, якія адбываліся ў свеце, з тым, якія асаблівасці набывае літаратурны тэкст XIX ст. (і не толькі XIX ст.).

2. Неразуменне рамантычнай іроніі і сатыры.

3. Уяўленне пра тое, што рамантычны герой – гэта толькі станоўчы персанаж, які моцна кахае.

4. Неразуменне тонкасцей псіхалогіі герояў.

5. Літаральнае прачытанне і адсутнасць увагі да дэталяў.

6. Цяжкасці ўспрыняцця вялікага па аб'ёме тэксту і доўгіх разважанняў герояў ці аўтарскіх адступленняў.

У артыкуле падкрэсліваецца значэнне мастацкай літаратуры для творчага развіцця незалежна ад абранага віду мастацтва.

**Ключавыя словы:** XIX стагоддзе, выкладанне, студэнт, літаратура, рамантызм, рэалізм, тэкст, пісьменнік, кампазітар, псіхалогія.

*S. Tychina,*
*Candidate of Philological Sciences, Associate Professor of the Department of Belarusian and Foreign Philology of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts"*

# FEATURES OF TEACHING LITERATURE OF THE 19TH CENTURY AMONG STUDENTS OF CREATIVE SPECIALTIES

**Abstract.** The article considers the peculiarities of teaching literature in the 19th century among students of creative specialties and notes that it is worth paying students' attention to the close connection between different types of art that arose in the 19th century, to voicing topical problems that were not previously raised by writers of that time, etc. The author highlights the following problems that may arise when students study texts:

1. The inability to connect the events that took place in the world with the features acquired by the literary text of the 19th century (not only the 19th century).
2. Misunderstanding of romantic irony and satire.
3. The idea that a romantic hero is only a positive character who loves a lot.
4. Misunderstanding of subtleties of psychology of characters.
5. Literal reading and lack of attention to detail.
6. Difficulty in perceiving a large amount of text and long reflections of characters or author's digressions.

The article emphasizes the importance of fiction for creative development, regardless of the chosen art form.

**Keywords:** 19th century, teaching, student, literature, romanticism, realism, text, writer, composer, psychology.

XIX ст. – гэта важны этап у сусветным літаратурным працэсе. Надзвычай добра характарызуе гэты час верш Ф. Шылера «Пачатак новага стагоддзя», дзе паэт піша пра нараджэнне новага стагоддзя і разбурэнне асноў старых форм. Рамантызм, панаванне якога ў літаратуры большасці еўрапейскіх краін прыпала на першую палову XIX ст., сапраўды адкрыў не толькі новы, поўны пачуццяў і перажыванняў погляд на жыццё, стасункі паміж людзьмі, але і імкнуўся раскрыць каштоўнасць чалавечай асобы, а таксама спрыяў нараджэнню і развіццю новых жанраў і тэм.

Адной з асаблівасцей рамантызму з'яўляецца тое, што гэты напрамак праявіў сябе ў розных відах мастацтва (літаратуры, жывапісе, музыцы), якія цесна ўзаемадзейнічаюць і ўзаемаўз-

багачаюцца. На гэта трэба ў першую чаргу звярнуць увагу студэнтаў творчых спецыяльнасцей. Варта паказаць, выкарыстоўваючы ў якасці ілюстрацыі літаратурныя тэксты і звесткі з жыцця розных пісьменнікаў, наколькі блізкімі з'яўляюцца розныя віды мастацтва, якія могуць выкарыстоўваць аднолькавыя прыёмы і падыходы. Напрыклад, Э. Т. А. Гофман быў не толькі знакамітым пісьменнікам, але і таленавітым кампазітарам, якому належаць оперы і сімфоніі. Рамантычная паэзія вылучалася сваёй мілагучнасцю, жаданнем уздзейнічаць на эмоцыі чытача не толькі сэнсам твора, але і яго гучаннем, імкненнем пісьменнікаў да спалучэння літаратуры з музыкай, што пазней падхапілі і перанялі аўтары-сімвалісты. Так, у тэкстах І. В. Гётэ (вершы «Марская цішыня»), у творчасці якога спалучаліся рысы розных плыняў, у тым ліку і рамантызму, можна сустрэць падбор слоў, сэнсам і гучаннем здольны перадаць асаблівую атмасферу.

Рэалізм, які выйшаў на першыя пазіцыі ў літаратуры пачынаючы з 30-х – 40-х XIX ст. і захоўваў свой ўплыў да 70-х гг. XIX ст., агучыў праблемы, што раней заставаліся па-за ўвагай грамадства. У XIX ст. узнікае асаблівая цікавасць пісьменнікаў да дзіцяці як да асобы. Для XIX ст. дзіця было ўвасабленнем беззаганнасці, бязгрэшнасці (але ў «Дзядах» А. Міцкевіча чыстыя душы малых не могуць патрапіць у рай, бо не зведалі ў жыцці нічога горкага). У творчасці пісьменнікаў з'яўляецца матыў «пакрыўджанага дзіця», які для некаторых аўтараў (Ф. Дастаеўскі, Ч. Дзікенс) становіцца скразным. У Ч. Дзікенса шэраг раманаў прысвечаны лёсу дзіця (напрыклад, «Прыгоды Олівера Твіста», «Дэвід Коперфільд»). Праблема выхавання дзіця і яго сталення ў жорсткіх умовах «дарослага свету» не ў апошнюю чаргу хвалявала пісьменніка ў сувязі з яго асабістым жыццёвым вопытам. У творчасці Ф. Дастаеўскага тэма лёсу дзіця (дакладней – пакутаў дзіця) таксама з'яўляецца вельмі важнай. Ёй прысвечаны старонкі ў «Братах Карамазавых», «Зняважаных і абражаных», «Вечным мужы». Яна, як адзначыў М. Бахцін, раскрываецца ў некаторых снах герояў Ф. Дастаеўскага, дзе перарастае ў асобную тэму – тэму пакрыўджанай дзяўчынкі (у сне Свідрыгайлава) [1, с. 262]. Пазней даследчык Д. Нячаенка ў сваёй працы «Сон, запаветных поўны знакаў» зробіць выснову: «Вобраз дзіцячай

цнатлівасці, рахманасці, беззаганнасці, “дзіця” – прынцыповы і шматсэнсавы мастацка-філасофскі сімвал у сістэме паэтыкі Дастаеўскага» [2, с. 277]. Дзіця ў рэалістаў не толькі мера чысціні, любові, але і папрок грахоўнаму чалавеку.

Пры выкладанні літаратуры XIX ст. могуць узнікнуць пэўныя праблемы, якія часта абумоўлены недахопам ведаў у студэнтаў, адсутнасцю цэласнай карціны развіцця літаратурнага працэсу, стэрэатыпамі і інш. Сярод гэтых праблем вылучаюцца:

1. Няўменне звязваць падзеі, якія адбываліся ў свеце, з тым, якія асаблівасці набывае літаратурны тэкст XIX ст. (і не толькі XIX ст.). Трэба засяродзіць увагу студэнтаў на тым, што з’яўленне рамантычнага героя непасрэдна звязана з рэвалюцыйнымі падзеямі, якія абумовілі спецыфіку яго характару (імкненне да свабоды, змаганне з несправядлівасцю, жаданне перарабіць свет, расчараванне, адзінота і інш.).

2. Неразуменне рамантычнай іроніі і сатыры (асабліва ў буйных па аб’ёме тэкстах ці творах, у якіх акцэнт робіцца на пачуццях герояў, ці ў якіх нешчаслівы фінал).

3. Уяўленне пра тое, што рамантычны герой – гэта толькі станоўчы персанаж, які моцна кахае. У гэтым выпадку мы маем справу са спрошчаным поглядам на рамантызм і рамантычную асобу. Напрыклад, вельмі часта на пытанне, хто з герояў рамана В. Гюго з’яўляецца рамантычным, студэнты называюць Квазімода ці Эсмеральду, але не Клода Фрало. Калі ж разглядаюцца дэтэктыўныя навэлы Э. А. По, то студэнты разважаюць пра тое, ці можна гэтыя творы аднесці да рамантызму, бо ў іх нічога не гаворыцца пра каханне і герой не праяўляе яркіх эмоцый.

4. Неразуменне тонкасцей псіхалогіі герояў. Напрыклад, падчас абмеркавання рамана «Сабор Парыжскай Божай Маці» студэнтамі агучваецца думка, што «Эсмеральда – недалёкая, бо кахала не Квазімода, а Феба». Наогул паглыбленне ў псіхіку герояў выклікае складанасці. І калі з рамантычнымі творамі разабрацца можна адносна хутка, то рэалістычныя творы вельмі часта могуць заблытаць студэнтаў. Напрыклад, Кацярыну Іванаўну з рамана Ф. Дастаеўскага «Браты Карамазавы» студэнты ўспрымаюць як выключна станоўчага, узвышанага персанажа, які ўсё жыццё імкнецца рабіць добрыя ўчынкі,

ахвяруючы сабой. А пры аналізе апавядання «Княгіня» А. Чэхава часам студэнты не могуць адрозніць адмоўнага героя ад станоўчага, мяркуючы, што ўсялякі чалавек, які імкнецца зрабіць дабро, – добры.

5. Літаральнае прачытанне і адсутнасць увагі да дэталяў. Звяртаючыся да рамана А. дэ Бальзака «Шчыгрынавая скура», студэнты часта цалкам давяраюць словам ілжывага персанажа, не задумваючыся пра яго характарыстыкі і дзеянні. Жаданне Куніна, персанажа з апавядання А. Чэхава «Кашмар», выправіцца і пачаць усім раздаваць грошы, успрымаеццца імі як цалкам магчымае.

6. Цяжкасці ўспрыняцця вялікага па аб'ёме тэксту і доўгіх разважанняў герояў ці аўтарскіх адступленняў, што з'яўляецца вынікам асаблівасцей выкладання думак у XIX ст. Аўтары нікуды не спяшаюцца і не стараюцца напоўніць свае творы звыклымі для людзей XXI ст. імклівымі падзеямі. Адсутнасць лаканізму ўспрымаецца студэнтамі як істотны недахоп твора. Часам можна пачуць выказванні пра тое, што твор яны чыталі «месцамі» (прапускалі ўрыўкі), бо там «доўга» ці «нудна».

Нягледзячы на пэўныя складанасці, літаратурныя творы XIX ст. выклікаюць цікавасць у большасці студэнтаў творчых спецыяльнасцей. Падрабязны разбор твораў, псіхалогіі герояў, паказ блізкасці праблем XIX і XXI ст., згадванне карцін (у тым ліку ілюстрацый да твораў), экранізацый і пастановак літаратурных тэкстаў, якімі натхняліся мастакі, рэжысёры і кампазітары, павінны паспрыяць больш глыбокаму аналізу літаратуры XIX ст. і разуменню важнасці не толькі гэтага перыяду, але і літаратуры ў цэлым для творчага развіцця, незалежна ад таго, які від мастацтва студэнт абірае.

1. *Бахтин, М.* Проблемы поэтики Достоевского / М. Бахтин. – М. : Изд. худ. лит., 1972. – 472 с.

2. *Нечаенко, Д. А.* Сон, заветных исполненный знаков: таинства сновидений в мифологии, мировых религиях и художественной литературе / Д. А. Нечаенко. – М.: Юрид. лит., 1991. – 304 с.